# ИСТОРИЯ
# HISTORY

УДК 37.017.4(476)(091)

**В. М. Астрога**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

## ПЫТАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ГРАМАДСКА-ПЕДАГАГІЧНЫМ РУХУ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

У артыкуле разглядаюцца пытанні развіцця нацыянальнай адукацыі ў грамадска-педагагічным руху Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. На фоне кансерватыўнай адукацыйнай палітыкі царскага ўрада, накіраванай на русіфікацыю краю, прагрэсіўная грамадскасць, дзеячы асветы, педагогі-навукоўцы, настаўнікі-практыкі разглядалі неабходнасць школьнага нацыянальнага будаўніцтва ва ўмовах дэмакратычнага развіцця краіны як важны накірунак рэфармавання народнай асветы. Прыводзяцца погляды прагрэсіўных педагогаў, літаратараў, публіцыстаў, настаўнікаў, якія адстойвалі ідэі не толькі ўвядзення ўсеагульнай пачатковай адукацыі на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі, але і падкрэслівалі неабходнасць стварэння сістэмы адукацыі, якая б улічвала мясцовыя нацыянальна-культурныя традыцыі і вялася на роднай мове. Паказана адлюстраванне дадзенай праблемы на старонках перыядычнага педагагічнага руху, а таксама ў беларускай газеце «Наша ніва», вызначана роля настаўнікаў у фарміраванні нацыянальнай свядомасці дзяцей беларусаў. Падкрэсліваецца, што многія часопісы дэманстравалі выхад за межы традыцыйных педагагічных праблем выхавання і методыкі выкладання, выконвалі важную сацыяльную ролю ў арганізацыі і інтэграцыі разрозненага грамадска-педагагічнага руху. Разам з тым канцэпцыя беларускай нацыянальнай школы магла атрымаць сваю рэалізацыю толькі ў новых дэмакратычных умовах на аснове перагляду каштоўнасных і якасных падыходаў ў галіне народнай адукацыі.

**Ключавыя словы:** грамадска-педагагічны рух, нацыянальная адукацыя, настаўнік, педагагічны друк, пачатковая школа, нацыянальнае адраджэнне.

**Для цытавання:** Астрога В. М. Пытанні нацыянальнай адукацыі ў грамадска-педагагічным руху Беларусі (канец XIX – пачатак XX ст.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2024. № 2 (287). С. 5–9.
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-287-1.

**V. M. Ostroga**
Belarusian State Technological University

## ISSUES OF NATIONAL EDUCATION IN THE SOCIO-PEDAGOGICAL MOVEMENT OF BELARUS (LATE 19TH – EARLY 20TH CENTURY)

The article discusses the development of national education in the socio-pedagogical movement of Belarus in the late 19th – early 20th century. Against the background of the conservative educational policy of the tsarist government aimed at Russification of the region, the progressive public, enlightenment figures, teachers, scientists, Practical teachers considered the need for school nation-building in the context of the democratic development of the country as an important direction of reforming public education. elarus. The views of progressive educators, writers, publicists, and teachers who defended the idea of not only introducing universal primary education throughout the Russian Empire, but also emphasized the need to create an education system that would take into account local national and cultural traditions and would be conducted in their native language. The reflection of this problem on the pages of the periodic pedagogical movement, as well as the Belarusian newspaper Nasha Niva, is shown, the role of teachers in the formation of the national consciousness of Belarusian children is determined. It is emphasized that many journals demonstrated going beyond the traditional pedagogical problems of upbringing and teaching methods, performed an important social role in the organization and integration of the disparate social and pedagogical movement. At the same time, the concept of the Belarusian national school could be realized only in new democratic conditions based on the review of value and qualitative approaches in the field of public education.

**Keywords:** social and pedagogical movement; National education; teacher, pedagogical press, primary school, national revival.

**For citation:** Ostroga V. M. Issues of national education in the socio-pedagogical movement of Belarus (late 19th – early 20th century). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2024, no. 2 (287 ), pp. 5–9 (In Belarusian).
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-287-1.

**Уводзіны.** У другой палове XIX – пачатку XX ст. накірункі і тэндэнцыі дзяржаўнай адукацыйнай і кадравай палітыкі краіны фарміраваліся ў кантэксце сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурна-нацыянальнага жыцця. Настаўніцтва, якое на той час складала значную частку інтэлігенцыі Беларусі, з'яўлялася дастаткова разрозненай групай па сацыяльным і нацыянальным паходжанні, сваёй прафесійнай падрыхтоўцы, светапоглядзе і палітыка-ідэалагічных пазіцыях. Але ў гэты час, нягледзячы на рэакцыйную і супярэчлівую палітыку царскага ўрада, пільны кантроль і шматлікія бюракратычныя перашкоды, шырыўся культурна-адраджэнскі і грамадска-педагагічны рух.

**Асноўная частка.** Газета «Наша ніва» якая выходзіла ў Вільні на працягу 1906–1915 гг., фактычна з'яўлялася першым масавым нацыянальным выданнем і ўнесла значны ўклад у працэс адраджэння культуры беларускага народа і станаўлення яго нацыянальнай свядомасці. На старонках гэтага перыядычнага выдання знайшлі шырокае асвятленне пытанні развіцця пачатковай адукацыі і барацьбы за пашырэнне асветы сярод мясцовага насельніцтва, уключаючы неабходнасць увядзення ўсеагульнай адукацыі.

Важная роля ў арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу адводзілася настаўніцтву. Выкарыстоўваючы свае прафесійныя педагагічныя магчымасці, настаўнікі, як лічылі «нашаніўцы», павінны былі вярнуцца да сваіх родных каранёў і мовы, уключыцца ў працу нацыянальна-культурнага адраджэння, весці асветніцкую работу не толькі сярод дзяцей, але і мясцовага насельніцтва. Так, адзін з настаўнікаў Беларусі звяртаўся да сваіх калег – «вучыцеляў» з пытаннем: «Чаму вы так непрыхільна ўзіраецеся на святую працу адраджэння нашага роднага народу? Чаму вас так мала ў радах працаўнікоў гэтай святой ідэі?» Ён крытыкуе погляды розных выкладчыкаў, якія сцвярджалі, што родная мова «ўмёрла, ужо не васкрэсне», альбо перакананне, што «няма патрэбы дзяліцца на колькі нацыянальнасцей, а трэба ўсім нацыям ісці да адной мэты інтэрнацыяналізму». Не губляючы аптымізму і надзеі, ён далей піша: «Душа цешыцца, як чытаеш ім на іх роднай, добра зразумелай мове. Уваходжу ў школу з «Нашай нівай», зараз сціхае гул і праносіцца радасны шэпт: будзе чытаць вучыцель па-просту». Ён часта чытаў сваім вучням байкі, вучыў беларускія вершы і заклікаў усіх настаўнікаў «не ганьбаваць сваім родным і не сароміцца яго, а любіць ўсёй душой і працаваць» [1, с. 3]. Такім чынам, з вуснаў настаўніка дзеці маглі пачуць надрукаваныя ў газеце беларускія народныя казкі, вершы, легенды, паданні, даведацца пра старонкі гісторыі роднага краю і свежыя падзеі.

У гэтай сувязі тагачасны беларускі паэт і публіцыст С. Палуян пісаў: «…калі на Беларусі з аднаго канца ў другі пракацілася хваля нацыянальнага адраджэння, беларускія настаўнікі аднымі з першых сталі ў шэраг работнікаў народнага вызвалення» [2, с. 42]. Вясковыя «вучыцелі», ураджэнцы Беларусі, уключыліся ў шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць сярод мясцовага насельніцтва, асноўнымі накірункамі якой з'яўлялася правядзенне народных чытанняў, арганізацыя выдачы кніжак са школьных бібліятэк, выкладанне дарослым ў нядзельных школах, на адукацыйных курсах, гандаль кнігамі са складоў і інш. [3, с. 74]. Прысланыя ж выкладчыкі ў сярэднія навучальныя ўстановы з цэнтральных рускіх губерняў па зразумелых прычынах аказаліся «зусім няздольнымі служыць беларускаму нацыянальнаму інтарэсу» [4, с. 27].

Канец XIX – пачатак XX ст. – перыяд станаўлення і развіцця педагагічнай журналістыкі як самастойнага грамадскага і сацыяльна-культурнага феномену, сродку выхавання і распаўсюджвання перадавых педагагічных поглядаў і тэорый. У 1909 г. у Пецярбургу ўбачыў свет зборнік настаўнікаў Віцебскага педагагічнага таварыства «Белорусский учитель». Усе пытанні, якія чакалі свайго абмеркавання і асвятлення, фактычна з'яўляліся праграмай грамадска-педагагічнага руху перадавой настаўніцкай інтэлігенцыі: увядзенне ўсеагульнага навучання, рэфармаванне народнай школы, выкарыстанне перадавых метадаў навучання і выхавання, удасканаленне падрыхтоўкі настаўнікаў, арганізацыя культурна-асветніцкай дзейнасці ў вёсцы і інш. Была звернута ўвага на тое, што на працягу апошіх гадоў назіралася «абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, заўважаецца імкненне да распрацоўкі і развіцця беларускай мовы, уздымаецца пытанне аб нацыянальнай беларускай школе… аб мове выкладання». Рэдакцыя часопіса заклікала да вырашэння гэтага пытання беларускага настаўніка, якому яно было «найбліжэй» і які павінен выказаць адносна беларускай школы «свой аўтарытэтны погляд».

У гэтай сувязі не мог застацца незаўважаным артыкул С. Русавай «На якой мове вучыць у школах Беларусі». Яна актыўна крытыкавала пазіцыю дзеючай арганізацыі «Белорусское общество» ў Вільні і ўсіх тых, хто лічыў, што «найбольш адпаведнай зброяй культурнай дзейнасці беларускіх арганізацый і культурнага развіцця беларускай народнасці можа з'явіцца толькі руская мова», і сцвярджала, што без сваёй мовы не можа быць і народа. «Голас беларускіх народных настаўнікаў адзін можа праўдзіва адказаць, – пісала яна, – ці патрэбны беларускаму народу школы з выкладаннем на яго сялянскай мове з кнігай, напісанай на ёй» [5, с. 1, 4, 44, 46]. Разам з тым такія публікацыі былі адзінкавымі: звычайна аўтары абыходзілі пытанне пра неабходнасць адкрыцця беларускіх школ і выкладяння ў іх на роднай мове.

Заснаваны ў 1890 г. рускім педагогам і гісторыкам Гурэвічам Я. Р. педагагічны часопіс «Русская школа» быў адрасаваны шырокім колам грамадскасці, настаўнікам, дзеячам народнай асветы, бацькам і інш., з аднолькавай увагай адносіўся да ўсіх тыпаў навучальных устаноў і знаходзіўся на дастаткова прагрэсіўных ліберальных пазіцыях. У гэтай сувязі інтарэс уяўляе публікацыя рускага педагога, краязнаўцы, гісторыка літаратуры Залатарова С. А. «Руская мова ў агульнаадукацыйнай школе». Ён падкрэслівае, што вельмі важным з'яўляецца пытанне пра тое, як навучаць дзяцей роднай мове ў будучай дэмакратычнай школе. Адзначаючы каштоўнасць вяртання ёй «належнага месца», педагог сцвярджаў, што «роднае слова не толькі прадмет вывучэння, але і найважнейшы сродак навучання; роднае слова служыць глыбокай крыніцай і наймацнейшым рухавіком духоўнага развіцця дзяцей». Акрамя гэтага, заўважалася неабходнасць «уласна жывога слова настаўніка ў выкладанні роднай мовы» (рускай альбо іншых), цікавасць усяго навучальнага курса і непасрэдная яго звязанасць з жыццём і патрэбамі. Аўтар сцвярджаў таксама, што і руская мова павінна заняць сваё пачэснае месца ў вывучэнні і выкладанні на ёй розных прадметаў у агульнаадукацыйнай школе Расіі. Ён падкрэсліваў, што не трэба бачыць у рускай мове пагрозу сваёй самабытнасці, неабходна шукаць «рацыянальныя прыёмы» яе вывучэння ва ўмовах адсутнасці на той час школьных падручнікаў на нацыянальных мовах [6, с. 131, 133, 130].

Я. Колас вядомы не толькі сваёй літаратурнай творчасцю, але і педагагічнай дзейнасцю. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ў 1902 г. працаваў вясковым народным настаўнікам. Яшчэ падчас навучання ён захапляўся мастацкай літаратурай, збіраў і запісваў фальклорныя творы і этнаграфічныя матэрыялы. Займаючы актыўную грамадзянскую пазіцыю, быў удзельнікам грамадска-педагагічнага руху і падтрымліваў сувязі з газетай «Наша ніва». Яе рэдактар Уласаў А. М. падтрымаў імкненне мясцовага памешчыка Гардзялякоўскага К. А. адкрыць у адным са сваіх маёнткаў пад Талачынам беларускую школу і параіў на месца настаўніка К. Міцкевіча (потым называў яго «першым беларускім вучыцелем першай беларускай школы»). Як вядома, беларуская мова афіцыйна не прызнавалася і навучанне на ёй забаранялася: усе так званыя «тайныя школы» ўзмоцнена праследаваліся. Але Канстанцін Міхайлавіч з натхненнем уключыўся ў працу: былі набыты ўсе неабходныя вучнёўскія прылады, «Беларускі лемантар», «Першае чытанне для дзяцей беларусаў» і іншая літаратура. У працэсе выкладання самая непасрэдная ўвага ўдзялялася вывучэнню беларускай літаратуры і культуры, роднай прыроды, нават задачкі складаліся на матэрыяле беларускага народнага побыту. Яго былыя вучні ўспаміналі, што і песні ў вольныя хвілінкі спявалі ўсе разам на беларускай мове (напрыклад, «Чаму ж мне не пець» і інш.) [7, с. 41].

Гэтым часам Я. Колас не толькі піша вершы і апавяданні для хлопчыкаў і дзяўчынак, але і падручнік «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», які быў выдадзены ў Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў нашаваконца» (1909 г.), артыкулы «Аб народным вучыцелю» і «Беларуская мова ў казённай школе». Для яго літаратурная творчасць стала тым сродкам, дзякуючы якому настаўнік імкнуўся зрабіць уплыў на павышэнне асветы народа, яго нацыянальнай і грамадскай свядомасці. Нягледзячы на тое, што настаўніцкая праца К. Міцкевіча з 18 вучнямі ў в. Сані працягвалася чатыры няпоўныя месяцы – з 8 студзеня да канца красавіка 1908 г., яна «мела гістарычнае значэнне для развіцця беларускай культуры, адукацыі, станаўлення нацыі ўвогуле» [8, с. 66, 68].

Ф. Кудрынскі (літаратурны псеўданім Б. Сцепанец) быў не толькі педагогам (выкладаў у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі і навучальных установах Вільні) і ўдзельнікам грамадска-педагагічнага руху, але і даследчыкам, этнографам і публіцыстам. Ён выдаў некалькі нарысаў, у тым ліку «Беларусы», актыўна публікаваўся на старонках педагагічных часопісаў. У сваім артыкуле «Аб нацыянальным выхаванні» сцвярджаў, што яно «павінна быць нацыянальнае», і «калі народ жадае з гонарам выконваць сваю ролю ў гісторыі, ён не можа адрачыся ад сваёй народнасці, пад апаскай адмовіцца і ад сваёй гістарычнай ролі і быць паглынутым іншымі народамі». Ён падкрэсліваў: «…калі народ жадае быць жывым і моцным, ён павінен фармаваць духоўныя сілы маладога пакалення абавязкова на глебе нацыянальнай». У гэтай няпростай справе вельмі

важную ролю адводзіў «айчыннай мове – сэрцу народа», а таксама асобе настаўніка – душы школы – і яго «педагагічнаму ўмельству развіваць душу дзяцей у спецыяльным, нацыянальным накірунку» [9, с. 203].

Але, як падкрэслівалі сучаснікі, у большасці ж выпадкаў «нацыянальнае пачуццё настаўніка…, асабліва беларуса, моцна было задушана, у большасці было атулена як-бы летаргічным сном» [10, с. 138]. А менавіта ён, як прадстаўнік інтэлігенцыі, у першых радах павінен быў уключацца ў справу нацыянальнага адраджэння, выхоўваць у свядомасці мясцовага грамадства нацыянальныя каштоўнасці адукацыі. Важнымі рычагамі ў рэалізацыі гэтай справы і актывізацыі грамадскай дзейнасці настаўнікаў станавілася распаўсюджванне прагрэсіўнай літаратуры, наяўнасць актуальных матэрыялаў у педагагічным друку, наладжванне краязнаўчай работы, удзел у адукацыйных экскурсіях, педагагічных нарадах і форумах, а таксама самаадукацыя. Для правядзення выхаваўчай і нацыянальна-асветніцкай работы сярод дзяцей і мясцовага насельніцтва настаўнік павінен быў сам усвядоміць яе патрэбу і праявіць жаданне, а для гэтага ведаць гісторыю беларускага краю, асаблівасці і дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, яго фальклор, традыцыі, звычкі, менталітэт, народныя святы і інш.

Значнай праявай грамадска-педагагічнага руху ў разглядаемы перыяд з'яўляліся настаўніцкія сходы (з'езды), якія аб'ядноўвалі перадавых «вучачых» і выконвалі найважнейшую прафесійную функцыю абмену вопытам працы, фарміравання навуковай свядомасці, а таксама новых узораў педагагічнай культуры, асновай якой становіліся грамадзянская адказнасць і дэмакратызацыя ўсёй школьнай сістэмы. 25 мая 1907 г. на сходзе ў Вільні быў створаны Беларускі настаўніцкі саюз. Прынятая праграма вызначала асноўныя накірункі яго дзейнасці: барацьбу за перабудову школы на новых, дэмакратычных пачатках, увядзенне ў школах навучання на роднай мове, а таксама незалежнасць школы і настаўніцтва ад рознага начальства [11, с. 6]. Першы Усерасійскі сход па народнай адукацыі асуджаў русіфікатарскую палітыку ў нацыянальных ускраінах і прыняў больш як 20 рэзалюцый адносна розных нацыянальных навучальных устаноў. Не былі абдзелены ўвагай і праблемы развіцця беларускай школы. Упершыню ў гісторыі агульнарасійскага грамадска-педагагічнага руху на такім высокім узроўні прагрэсіная частка настаўніцтва выказалася на карысць роднай мовы выкладання ў «инородческой» школе. Уступкі ў галіне народнай асветы, якія вымушаны быў зрабіць урад для нярускіх народнасцей падчас і пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг., не распаўсюджваліся на ўжыванне беларускай мовы [12, с. 242, 161]. І толькі незадоўга да пачатку 1914/1915 навучальнага года царскія ўлады далі дазвол на адкрыццё беларускамоўных школ [4, с. 31].

**Заключэнне.** Такім чынам, ажыўленне культурна-адраджэнскага руху патрабавала пошуку ўласных нацыянальных ідэалаў і каштоўнасцей у сістэме асветы, арганізацыі працы ў навучальных установах на роднай мове. Аднак царскі ўрад, праводзячы палітыку русіфікацыі краю і абапіраючыся на афіцыйную ўстаноўку «адна нацыя – адна дзяржава», нацыянальную адукацыю і барацьбу мясцовага настаўніцтва за фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці нашага народа разглядаў як істотную перашкоду ў рэалізацыі сваёй кансерватыўнай палітыкі.

## Спіс літаратуры

1. Арол М. З нашага жыцця // Наша ніва. 1912. 21 чэрвеня. С. 3.

2. Палуян С. Лісты ў будучыню. Проза. Публіцыстыка. Крытыка. Мінск: Мастацкая літаратура, 1986. 215 с.

3. Багдановіч А. І. Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі (1861–1900). Мінск: БНТУ, 2012. 153 с.

4. Андрэева Е. Г., Лыч Л. М. У пошуках уласнага шляху: ідэя беларускай школы напачатку XX ст. // Адукацыя і выхаванне. 2000. № 2. С. 26– 31.

5. Белорусский учитель. СПб., 1909. Вып. 1. 65 с.

6. Золотарев С. Русский язык в общеобразовательной школе // Русская школа. 1908. № 10. С. 117–131.

7. Калоша І. І. Якуб Колас – народны настаўнік // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1972. № 1. С. 40–41.

8. Салаўёва Н. В. Якуб Колас і Віцебшчына: «першы беларускі вучыцель першай беларускай школы» // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэспублік. навук.-практ. канф., Віцебск, 30–31 сак. 2010 г. / Віцебскі дзярж. ун-т, рэдкал.: В. У. Акуневіч адк. рэд. [і інш.]. Віцебск: УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2010. С. 65–69.

9. Степанец Б. О национальном воспитании // Народное образование в Виленском учебном округе. 1909. № 5. С. 203–206.

10. Троська Я. Некаторыя моманты з дарэвалюцыйнае асветы на тэрыторыі Магілёўшчыны // Полымя. 1926. № 1. С. 128–141.
11. З Беларусі і Літвы (ад нашых карэспандэнтаў) // Наша ніва. 1907. 8 чэрвеня. С. 6.
12. Снапковская С. В. Развитие образования и педагогической мысли Беларуси во второй половине XIX – начале XX вв. М.: Старицкая тип., 2011. 308 с.

**References**

1. Arol M. From our life. *Nasha niva* [Our field], 1912, 21 June, p. 3 (In Belarusian).
2. Paluyan S. *Listy u buduchynyu. Proza. Publitsystyka. Krytyka* [Letters to the future. Prose. Journalism. Criticism]. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1986. 215 p. (In Belarusian).
3. Bagdanovich A. I. *Navukovaya i kul'turna-asvetnitskaya dzeynasts' inteligentsyi Belarusi (1861–1900)* [Scientific and cultural and educational activities of the intelligentsia of Belarus (1861–1900)]. Minsk, BNTU Publ., 2012. 153 p. (In Belarusian).
4. Andreeva E. G., Lych L. M. In search of one's own path: the idea of the Belarusian school at the beginning of the XXth century. *Adukatsyya i vykhavanne* [Education and upbringing], 2000, no. 2, pp. 26−31 (In Belarusian).
5. *Belorusskiy uchitel'* [Belarusian teacher]. St. Petersburg, 1909, Issue 1. 65 p. (In Russian).
6. Zolotarev S. Russian language in comprehensive school. *Russkaya shkola* [Russian school], 1908, no. 10, pp. 117−131 (In Russian).
7. Kalosha I. I. Yakub Kolas is a national teacher. *Pomniki gistoryi i kul'tury Belarusi* [Monuments of the history and culture of Belarus], 1972, no. 1, pp. 40−41 (In Belarusian).
8. Salaueva N. V. Yakub Kolas and Vitebsk region: «the first Belarusian teacher of the first Belarusian school». *Adukatsyya na Vitsebshchyne: gistoryya i suchasnasts': materyyaly respublikanskay navukova-praktychnay kanferentsyi* [Education in Vitebsk region: history and present: materials of the republican scientific and practical conference]. Vitsyebsk, 2010, pp. 65–69 (In Belarusian).
9. Stepanets B. About national education. *Narodnoye obrazovaniye v Vilenskom uchebnom okruge* [Public education in the Vilnius educational district], 1909, no. 5, pp. 203−206 (In Russian).
10. Tros'ka Ya. Some moments of pre-revolutionary education in Mogilev region. *Polymya* [Flame], 1926, no. 1, pp. 128−141 (In Belarusian).
11. From Belarus and Lithuania (from our correspondents). *Nasha niva* [Our field], 1907, 8 June, p. 6 (In Belarusian).
12. Snapkovskaya S. V. *Razvitiye obrazovaniya i pedagogicheskoy mysli Belarusi vo vtoroy polovine XIX – nachale XX v.* [Development of education and pedagogical thought in Belarus in the second half of the 19th – early 20th century]. Moscow, Staritskaya tip. Publ., 2011. 308 p. (In Russian).

**Інфармацыя пра аўтара**

**Астрога Валянціна Міхайлаўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а. Рэспубліка Беларусь). E-mail: ostroga@belstu.by

**Information about the author**

**Ostroga Valentina Mikhailovna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroga@belstu.by

*Паступіў 14.09.2024*